**Іван Дабракоў**

# Душа майстра

Прадметы з гісторыяй. Сямейныя рэліквіі. Шрамы часу. Кожная, нават самая маленькая сямейная рэч мае сваю гістрыю, пра якую мы даведваемся ад сваіх бабуль і дзядуль, беражліва захоўваем і перадаём з пакалення ў пакаленне. Ёсць такія рэчы і ў нашай сям'і. Не, гэта не фамільныя каштоўнасці, золата ці брыльянты. Гэта простыя драўляная міска і лыжка, зробленыя вясковым бондарам і падараваныя маім прапрабабулі і прапрадзядулю на вяселле.

Так, звычайны драўляны посуд, які, здавалася б, яшчэ нядаўна можна было сустрэць у любой вясковай хаце. Але для мяне гэта не проста лыжка і міска, гэта гісторыя, якая нагадвае пра нашыя карані. Гэта своеасаблівы якар, які прывязвае нас да нашай сям'і і перадае станоўчую энергію папярэдніх пакаленняў. Калі бяру ў рукі гэтыя старыя рэчы, я быццам бы трапляю ў свет магіі і адчуваю сябе часцінкай мінулага. І пачынаецца чараўніцтва, сапраўдная гісторыя…

Мая прапрабабуля ў гэты дзень прыслужвала на панскай кухні і стала жывым сведкам тых падзей. Гэта быў нічым не прыкметны, звычайны зімні дзень. Хіба толькі сонца свяціла ярчэй, і снег так блішчаў пад яго промнямі, што немагчыма было глядзець па баках – сляпіла вочы. За акном, у прадчуванні хуткай вясны, весела шчабятала і кружылася сямейка вераб'ёў. Якраз у гэты час на двары панскага дома з'явіўся стары майстар Даніла. Паставіўшы саначкі каля ганка, ён штосьці весела расказваў сваёй жонцы Аўдоцці і смяяўся ад душы, як дзіця.

Усе ў ваколіцы ведалі Данілу як надзвычайнага бондара, сапраўднага майстра з "залатымі рукамі". Сёння ён прывёз заказ для самой пані.

Даніла зайшоў на кухню, зняў шапку, расшпіліў кажух і пачаў выстаўляць на стол свой посуд. Ён так беражліва браў у рукі кожную міску і лыжку, быццам бы яны былі зробленыя не з простага дрэва, а з найтанчэйшага французскага фарфору ці муранскага шкла. З любоўю і гонарам глядзела на свайго мужа Аўдоцця.

Вось на кухню зайшла пані з эканомкай. Сэрца Данілы шалёна закалацілася, здавалася, што ўсе, хто стаяў побач, чулі гэты стук. Нарэшце настаў яго зорны час! Зараз пані, гэтая знакамітая жанчына, такая разумная, адукаваная, з далікатнымі манерамі, ацэніць яго працу з годнасцю. У Данілы закружылася галава, перахапіла дыханне, яго абдала потам.

Пані, шоргаючы сукенкай, праслізнула міма стала з посудам і, не паглядзеўшы ў той бок, толькі суха спытала: "Колькі?" У гэты момант у Данілы на імгненне спынілася сэрца, пацямнела ў вачах. Ён не змог вымавіць ні слова. Здавалася, што сонца за акном знікла і свет вакол яго перастаў існаваць. "Колькі заплаціць?" – раздражнёна перапытала пані.

Даніла, быццам знямеўшы, працягваў маўчаць. З-за яго спіны выбегла разгубленая Аўдоцця. Збіваючыся і блытаючы словы, яна назвала цану. Пані загадала эканомцы разлічыцца з майстрам, грацыёзна развярнулася і, ні на кога не зірнуўшы, шпарка пайшла прэч. Эканомка, сунуўшы грошы ўзрушанаму Данілу, пабегла даганяць сваю гаспадыню.

На кухні запанавала маўчанне. І сярод гэтай мёртвай цішыні ўсе пачулі абураны голас пані, які даносіўся з глыбіні калідораў: больш не турбаваць яе па такіх дробязях.

У гэты момант Даніла, быццам прачнуўшыся, кінуўся на двор. Не адчуваючы холаду, без шапкі, у расшпіленым кажуху, стаяў ён на парозе панскага дома. Грошы… Праклятыя грошы пяклі яму руку, і ён з агідаю шпурнуў іх пад ганак. Услед за ім, быццам апараная, выбегла Аўдоцця.

На кухні, на вялікім стале, усё яшчэ стаяў зроблены Данілам посуд. Зусім нядаўна ён пераліваўся на яркім зімнім сонцы тысячамі крышталікаў, а зараз быў усыпаны маленькімі кропелькамі ад расталых сняжынак. Здавалася, што ўсе гэтыя лыжкі, талеркі, міскі, вёдры, зробленыя з такой любоўю, з такой цеплынёй і чараўніцтвам, плакалі разам са сваім майстрам.

Цішыню на кухні перарвала старая кухарка. Убачыўшы праз акно, як Даніла выбягае за вароты панскага дома, а ўслед за ім, спрабуючы абняць і суцешыць, бяжыць Аўдоцця, яна прашаптала: “Памерла…” Усе са здзіўленнем паглядзелі на кухарку. Старая жанчына паківала галавой: “Эх, вы… Душа майстра сёння памерла…”

Пасля таго здарэння Даніла закінуў бондарскую справу і больш ніколі не дакрануўся да сваіх інструментаў. Майстар не можа тварыць, калі яго душа мёртвая, а сэрца халоднае.

Праз некалькі месяцаў пані прывезлі з Францыі раскошны фарфоравы посуд, і яна загадала пазбавіцца ад “той дзеравеншчыны”.

Старая кухарка ведала толк у добрых рэчах. Посуд майстра яна беражліва зберагла, а потым падарыла маёй прапрабабулі на вяселле.

Сёння ў наша бурнае стагоддзе навукова-тэхнічнага прагрэсу, у стагоддзе пластыкавага посуду, не перастаеш здзіўляцца: чаму з гэтай старой міскі і каша, і суп смачнейшыя, а лыжкай проста немагчыма абпячыся. Усе сакрэты свайго майстэрства забраў бондар Даніла з сабой у магілу.

І сапраўды, людзі гавораць, што талент – гэта іскра Божая, якой чалавек спальвае сябе, асвятляючы гэтым уласным пажарам шлях іншым.